Акушэвіч Андрэй Аляксандравіч
УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт” (Мінск)

# Роля Змітрака Бядулі ў стварэнні першага нумара дзіцячага часопіса «Зоркі»

Творы Змітрака Бядулі ўжо доўгі час уваходзяць у кола дзіцячага чытання, вывучаюцца ў праграме па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (гл.: [2; 3, с. 161–167; 11]. У асобных артыкулах творчасць пісьменніка вывучаецца ў кантэксце адукацыйнага працэсу, накрыклад, у публікацыях А. І. Белай [5], А. В. Шарапавай [14] і інш. У вучэбным дапаможніку пад агульнай рэдакцыяй А. М. Макарэвіча і М. Б. Яфімавай “Беларуская дзіцячая літаратура” (2008) Змітраку Бядулю прысвечаны манаграфічны артыкул [1, с. 160–181].

Трывалая сувязь пісьменніка з дзіцячай аўдыторыяй падтрымлівалася і дзякуючы таму, што ён з’яўляўся рэдактарам аднаго з першых беларускамоўных часопісаў для дзяцей “Зоркі” (друкаваўся ў 1921–1922 гг.), толькі 10 нумароў якога пабачылі свет [4, с. 109]. У згаданым вышэй дапаможніку для ўстаноў вышэйшай адукацыі даецца агульная характарыстыка адпаведнага выдання [1, с. 16–17, 172–173], у якой адзначаецца, што “аўтары публікацый імкнуліся да рознабаковага развіцця маленькага чытача, дбалі пра выхаванне яго на родным матэрыяле, блізкім дзіцячаму ўспрыняццю” [1, с. 17].

На вокладцы і старонцы 1 першага нумара часопіса “Зоркі” датай яго выхаду пазначана “25 лютага 1921 г.” [10] (з электроннай копіяй можна пазнаёміцца на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі [9]). Гэты нумар адкрываецца вершам Янкі Купалы “У школу”, што ўказвае на адпаведную накіраванасць выдання, яго чытацкі адрас (тут і ніжэй цытаты падаюцца згодна з “Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008)).

Клумак з кніжкамі пад пахай,
Думак поўна галава, –

Там, у школу даўным шляхам

Сыпе сельская дзятва [10, с. 1].

Знаходзім у гэтым нумары і яшчэ два вершы песняра, а менавіта: “Песня і казка (Для Налі С.)” [10, с. 6–7], “Вучыся” [10, с. 10].

У выданні прадстаўлены і davershavany твор “За зоркамі” Міхася Чарота, які абыгрывае назву часопіса і сцвярджае важнасць навукі:

За зоркамі яснымі, дзеці,

Ідзіце вы к шчасцю і долі,

Хоць цемра пануе на свеце,

Не згубіце сцежкі ніколі.

Вядуць яны к знанню, к навуцы,

К праўдзе і волі народу… [10, с. 6].

Вядомы як празаік, Кузьма Чорны выступіў пад сваім сапраўдным іменем (“Раманоўскі Мікола”) з дыдактычным вершам “К дзеткам” (тэкст прыводзіцца ніжэй цалкам). У ім дэкларуецца роля вучобы ў жыцці чалавека і грамадства.

К ДЗЕТКАМ

Вучыцеся, дзеткі, дужэйце на волі,

Каб скарбы навукі знайсці,

Каб лепш было з жыццем змагацца за долю

На роднай і мілай зямлі;

Бо цяжка, ой, цяжка змагацца тым людзям,

Хто ў вечнай цямноце жыве:

Не бачыць ён свету і бачыць не будзе,

Бо свет той навука дае… [10, с. 2].

Аўтарская проза для дзяцей таксама займае сваё месца ў выданні. У апавяданні Міколы Раманоўскага (Кузьмы Чорнага) пра значэнне роднай мовы “Гузік” [10, с. 5] заўважны гумарыстычны элемент, што запатрабавана адпаведнай мэтавай аўдыторыяй.

Фактычна публіцыстычным выступае тэкст “Валодзя Варанецкі”, які мае падзагаловак “Абразок з жыцця сляпых дзяцей” [10, с. 22–26]. У дадзеным творы расказваецца гісторыя хлопчыка Валодзі, які “паэксперэментаваў з гранатай”, а тая ўзарвалася і пакінула яго без зроку. Аўтар паказвае, як хлопец прыстасоўваецца да жыцця, як імкнецца да ведаў. Матэрыял пададзены настаўнікам Мінскай школы сляпых Лявонам Більдзюкевічам, які таксама пакінуў след у навуцы (гл.: [8]).

Значнае месца адведзена ў часопісе фальклорным творам: казкі “Каток, пеўнік і лісічка” [10, с. 11], “Як малы каток вялікіх звяроў напалохаў” [10, с. 12] і інш. Як рэдактар Змітрок Бядуля не мог не мець дачынення да іх падрыхтоўкі да друку. Подпіс “Падала В. Л-к” [10, с. 15] суправаджае вершаванае “Вяселле шчыгліка”, якое пачынаецца наступным чынам:

Шчыглік невялічкі грамаду збірае.
Сам не хоча адзін жыць , – жаніціся мае.
Узяў сабе пціцу, бараву сініцу, –
Красную, ясную вераб’я сястрыцу [10, с. 15].

Вельмі блізкі тэкст знаходзім у запісах Яна Чачота:

Шчыглік невялікі грамаду збірае,
Сам не хоча адзін жыць, жаніціся мае.
Узяў сабе пеіцу, бараву сініцу –
Красную, ясную вераб’я сястрыцу [13, с. 110].

Прадстаўлены ў часопісе матэрыял пра “шчыгліка” мог быць як апрацоўкай запісаў Яна Чачота, так і незалежна зафіксаваным варыянтам адпаведнага фальклорнага твора.

Напрыканцы вершаванага тэксту “Як дзед з бабай боб садзіў”, які мае падзагаловак “Народная байка” [10, с. 16–18], аўтар пазначаны літарамі “С. П.” (адразу заўважым, што літара “П” не зусім выразна надрукавалася ў тым асобніку, з якім давялося працаваць). Тым не менш, дадзены факт дазваляе выказаць асцярожнае меркаванне, што за псеўданімам “С. П.” хаваецца Змітрок Бядуля: “С. П.” можа быць расшыфравана як “С.[амуіл]

П.[лаўнік]”. У 5-цітомным зборы твораў Змітрака Бядулі тэксту з такой назвай няма, што бачна ў адпаведным алфавітным паказальніку (гл. [7, с. 509–517]), як няма і ў 35-м томе кніжнага праекта “Беларускі кнігазбор” (гл.: [6]). Прыведзеныя назіранні робяць твор “Як дзед з бабай боб садзіў” прэтэндэнтам як мінімум у раздзел “Dubia” наступнага збору твораў пісьменніка. Аднак толькі дадатковыя даследаванні дазволяць правесці канчатковую атрыбуцыю.

Завяршае часопіс першы акт п’есы М. Кудзелькі (Міхася Чарота) “Пастушкі”, пасля якога ў дужках перад іменем аўтара стаяць словы “Канец будзе” [10, с. 27–32]. Такі прыём дазваляе заінтрыгаваць чытача, выкарыстаць спецыфіку перыядычнага выдання, каб стымуляваць яго распаўсюджванне.

Структура першага нумара часопіса прадуманая. У ім можна вылучыць чатыры блокі. *Блок 1* [10, с. 1–10]: аўтарскія вершы і проза, якія чаргуюцца; сярод іх, пасля верша Янкі Купалы “У школу”, знаходзіцца апрацаваная народная казка пад назвай “Чырвоная курачка” (разказваецца, як курачка знайшла пшанічнае зярнятка, прыгатавала хлеб, не пачаставала гультаек гуску ды качачку і сама яго з’ела). *Блок 2* [10, с. 11–21]: фальклор (вылучаны загалоўкам “Народныя казкі”; прадстаўлены празаічнымі і вершаванымі тэкстамі; з улікам вышэйсказанага асаблівы статус мае тэкст “Як дзед з бабай боб садзіў”). *Блок 3* [10, с. 22–26]: публіцыстыка (ужо разгледжаны твор Л. Більдзюкевіча). *Блок 4* [10, с. 27–32]: драматургія (згаданая вышэй частка п’есы Міхася Чарота). У выданні назіраецца імкненне прадставіць творы розных родаў літаратуры, у тым ліку ў педагагічных мэтах падаецца адмыслова адабраны фальклор; прысутнічае накіраванасць на тэмы вучобы, навукі, новага жыцця, што адзначася даследчыкамі і раней (гл.: [1, с. 172]). Чытачам актыўна прапаноўваецца творчасць іх сучаснікаў. Усё гэта гаворыць пра сур’ёзную рэдактарскую працу.

Значнае месца ў першым нумары надаецца і творчасці самаго Самуіла Плаўніка. Свае празаічныя казкі рэдактар размясціў у часопісе пад

псеўданімам “З. Бядуля” (“Панская хвароба” [10, с. 2–3], “Снежны дзед” [10, с. 7–9]), вершы – пад псеўданімам Ясакар (“Баю, баю баечку” [10, с. 4], “Дзед Мароз” [10, с. 9–10]). Падкрэслім, што Міхаіл Кудзелька таксама выступае ў часопісе пад рознымі імёнамі: як М. Чарот (“За зоркамі”) і як М. Кудзелька (“Пастушкі”). Такі падыход стварае ў непадрыхтаванага чытача ўражанне, што над нумарам працавала большая колькасць пісьменнікаў, чым ёсць на самай справе.

Калі звярнуць увагу на асноўных аўтараў першага нумара, заўважаецца, што Змітрок Бядуля і Кузьма Чорны будуць сябрамі, а Міхась Чарот нават адным са стваральнікаў літаратурнага аб’яднання “Маладняк”, якое аформіцца ў 1923 годзе. Да таго ж вядома, што маладнякоўцы з вялікай пашанай ставіліся да Янкі Купалы. Гэта пацвярджае і зборнік “Маладняк – Янку Купалу” (1925) [12]. У ім аддаецца належнае прызнанаму класіку беларускай літаратуры, творчасць якога, як ужо адзначалася, сімвалічна адкрывае часопіс. Сказанае вышэй указвае на тое, што першы нумар дзіцячага часопіса “Зоркі” выглядае, так бы мовіць, “маладнякоўскім” яшчэ да ўзнікнення згаданага літаратурнага аб’яднання. Не супярэчыць гэтаму назіранню і фальклор, змешчаны ў выданні, і адукацыйныя мэты, якія рэалізуюцца на яго старонках.

Такім чынам, Змітрок Бядуля прыняў удзел у стварэнні першага нумара часопіса “Зоркі” і як рэдактар, і як прадуктыўны аўтар. У гэтым нумары надрукаваны проза, паэзія, публіцыстыка і драматургія, а таксама беларускі фальклор. На старонках часопіса добра прадстаўлены творы тагачасных пісьменнікаў, якія будуць звязаны з літаратурным аб’яднаннем “Маладняк”, важнае месца адведзена творчасці Янкі Купалы, улічаны адпаведныя чытацкія запыты, падкрэсліваецца значэнне навукі (вучобы), у мастацкай форме агучваюцца задачы перыядычнага выдання, што толькі пачынала свой шлях.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 688 с.

2. Беларуская літаратура [Электронны рэсурс] // Нацыянальны адукацыйны партал. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2020-2021-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2020-2021/304-uchebnye-predmety-v-xi-klassy-2020-2021/3802-belaruskaya-l-taratura.html. – Дата доступу: 10.01.2021.

3. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электрон. дадаткам для павыш. узроўню) / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч і інш. ; пад рэд. А. П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І. Д. Воюш – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 294 с.

4. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск : БелЭн, 1998–2004. – Т. 7: Застаўка – Кантата / рэдкал. Г. П. Пашкоў і інш. – 1998. – 608 с.

5. Белая, А. І. Вывучэнне творчасці Змітрака Бядулі ў Х класе / А. І. Белая // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 5. – С. 3–8.

6. Бядуля, З. Выбраныя творы / З. Бядуля ; уклад., прадм., камент. У. Казберука. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 492 с.

7. Бядуля, З. Збор твораў : у 5 т. / З. Бядуля. – Мінск : Маст. літ., 1986–1989. – Т. 5: Язэп Крушынскі, кн. 2; Сярэбраная табакерка: казка; публіц. арт. / рэд. т.: У. В. Гніламёдаў, М. І. Мушынскі. – 1989. – 520 с.

8. Дзятко, Д. Лявон Більдзюкевіч / Д. Дзятко // Роднае слова. – 2014. – № 12. – С. 29–33.

9. Зоркі [Электронны рэсурс] // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: http://digital.nlb.by/files/original/ffa0285f88b3d7fe6a5a642e65acf57a.pdf. – Дата доступу: 10.01.2021.

10. Зоркі. – 1921. – № 1. – 32 с.

11. Лашкевіч, В. А. Змітрок Бядуля – дзецям / В. А. Лашкевіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 110 с.

12. Маладняк – Янку Купалу [Электронны рэсурс] // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: https://nlb.by/upload/prod/Maladnyak/3_Literatyrniya_vudani_%20by_Maladnyak/Knizhnitsa_Maladnyaka/4_Maladnyak_Kupaly.pdf. – Дата доступу: 10.01.2021.

13. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / уклад., сістэм. тэкстаў і камент. В. І. Скідана, А. М. Хрушчовай, уступ. арт. Т. В. Валодзінай; навук. рэд. А. С. Ліс. – 2-ое выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 330 с.

14. Шарапава, А. В. Вывучэнне творчасці Змітрака Бядулі ў кантэксце вучэбнай дысцыпліны “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура”: тэарэтычна-жанравы аспект / А. В. Шарапава // Актуальныя праблемы філалогіі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін : зб. нав. артык. / пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў, 2015. – С. 340–346.